ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
27 ЛЮТАГА
1992 ГОДА
№ 4(1670)

## Мітынг пастанавіў: «ДАМАГАЦЦА ВЫКАНАННЯ ПАТРАБАВАННЯЎ АЖ ДА ЗАБАСТОЎКІ»

**Мітынг, арганізаваны прафсаюзамі супрацоўнікаў ВНУ Мінска, сабраў не шмат людзей. Здаецца, гэта толькі пачатак барацьбы...**

**Мы папрасілі адказаць на некалькі пытанняў старшыню прафкома супрацоўнікаў БДУ Анатоля Васільевіча ПАЎЛАВА.**

— Анатоль Васільевіч, дык чаго вы дамагаецеся?

— Мы ведаем вопыт краін, якія сталі на шлях развіцця, дзе самым прыярытэтным лічыцца ўкладанне капіталу ў народную адукацыю. Мы бачым у нас адмоўныя адносіны да інтэлектуальнай працы на ўсіх узроўнях. І, усведамляючы ролю інтэлігенцыі ў нашым жыцці, жадаем спыніць актыўны распад, катастрафічнае разбурэнне вышэйшай школы, якое пачалося ўжо.

— Якія асноўныя патрабаванні змяшчае прынятая на мітынгу рэзалюцыя?

— Нашы патрабаванні справядлівыя: мы патрабуем увесці ў хуткім часе Закон «Аб адукацыі» Рэспублікі Беларусь у поўным аб'ёме; забяспечыць усіх жадаючых супрацоўнікаў ВНУ зямельнымі надзеламі для індывідуальнага і дачнага будаўніцтва ў радыусе 50 кіламетраў ад горада; вызваліць вузаўскую навуку ад падаткаабкладання; павялічыць студэнтам кампенсацыю за падаражанне харчавання з 5 да 15 рублёў у дзень і камандзіровачныя выдаткі на час вытворчай практыкі з 4 да 15 рублёў у суткі.

— Чаго вы дамагліся ў выніку мітынгу?

— Галоўнае — грамадскага рэзанансу.

— Ці падтрымлівае вас новы міністр адукацыі?

— Так, падтрымка з яго боку ёсць. Але ж сёння ўсё так складана...

— Ці рыхтуецеся вы да новых мер у тым выпадку, калі патрабаванні не будуць задаволены ў хуткім часе?

— Вядома, і ўдзельнікі мітынгу пагадзіліся з гэтым рашэннем прафсаюзнага актыву і Савета па каардынацыі забастовачнага руху: дамагацца выканання нашых патрабаванняў аж да забастоўкі. Але асабіста я, шчыра кажучы, не прыхільнік самых крайніх мер.

БІРЖАВЫЯ ВЕДАМАСЦІ

## КУРС ДОЛАРА ПАДАЕ

### І КАЛІ ЁН ДАСЯГНЕ ДВУХ РУБЛЁЎ, СТУДЭНТЫ ЗМОГУЦЬ СПАЦЬ СПАКОЙНА

Вы спрабавалі шукаць сабе кватэру ці асобны пакой, на крайні выпадак? Цяжкая справа. Усе такія аб'явы, акрамя слова «здаю», аб'ядноўвае яшчэ адно — «СКВ».

Прыкладна 1000 студэнтаў нашага універсітэта жывуць на кватэрах. У мінулым годзе кожны з іх атрымліваў кампенсацыю — 20 рублёў у месяц.

Па словах старшыні студэнцкага прафкома Адама Данілавіча КІШКЕВІЧА, у гэтым годзе лічба будзе павялічана да 50 рублёў.

У такім выпадку студэнту застанецца адно: уважліва сачыць за курсам валюты (а ён, на шчасце, зараз падае). І калі адзін долар будзе каштаваць 2 рублі, уладкавацца і спакойна вучыцца далей.

ДУМАЙ, СТУДЭНТ, ДУМАЙ

ШТО БЫЛО!



## СТРАШЭННА ХОЧАЦЦА ПАВАЯВАЦЬ

*Тыя, каму не абрыдлі палітычныя тусоўкі, маглі задаволіцца ў мінулыя выхадныя на мітынгах БНФ або камуністычнага руху. Пагаманіць з аднадумцамі, паслухаць гарачыя выступы аратараў. У парку імя Горкага людзі віншавалі адзін аднаго са святам Савецкай Арміі і патрабавалі адзінства Саюза, а на плошчы Незалежнасці гаварылі аб неабходнасці рэферэндуму. Плюралізм думак ля мікрафона ні на адным з мітынгаў не дапускаўся.*

*А мокрага снегу на твары і каўнеры мяцеліца пасыпала пароўну.*

Фота Сяргея ГРЫЦА.

ВЯЛІКІ ДЗЯКУЙ!

## Вучыцеся на здароўе!

Амаль усе студэнты універсітэта не атрымалі стыпендыю своечасова. У лютым супакоіліся: сума стыпендыі за два месяцы выглядала ўнушальна.

Шкада толькі, што якая на самой справе студэнцкая стыпендыя і з чаго яна складаецца, не кожны ведае. Дык вось, па апошніх дадзеных, з 1 студзеня 1992 года ўведзены наступныя памеры стыпендый у ВНУ: паспяваючым студэнтам — у памеры 280 рублёў у месяц, студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі,— 320 рублёў, а толькі выдатныя — 360 рублёў. Прыплюсуйце да кожнай з іх лічбаў 150 рублёў кампенсацыі ды купоны — усе 100 працэнтаў, і маеце ўсё на ўсё.

Увесь месяц можна адзін раз у дзень абедаць «аж» за 15 рублёў, пры гэтым, дарэчы, ездзіць у гарадскім транспарце «зайцам» альбо дабірацца на заняткі пехатой. Не наведваць магазінаў, не ездзіць дадому, не хадзіць на выставы, у кіно, тэатры, адным словам, НЕ СТАЯЦЬ У ЧАРЗЕ НІКОЛІ, а гэта значыць — берагчы здароўе, якое даражэй за ўсё.

## ІНТЭРНАТ, ЯКІ ГУЛЯЎ САМ ПА САБЕ...

***Дырэктары сярэдніх спецыяльных устаноў і рэктары ВНУ атрымалі да абмеркавання Праект нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі па пераводу інтэрнатаў навучальных устаноў на прынцып работы гасцініц.***

Студэнты мелі б магчымасць самі распараджацца грашыма, набіраць штат у сваю будучую гасцініцу. А пад час канікул, напрыклад, здаваць нумары каму-небудзь з прыезджых.

У рэспубліканскім друку прагучала ўжо і лічба — 8 рублёў за суткі пражывання ў «камфартабельных» інтэрнацкіх пакоях. Здаецца, што несвоечасова. Па-першае, цана будзе скакаць у залежнасці ад разраду гасцініцы і катэгорый пакояў. Студэнцкі прафком, напрыклад, прапануе трэці разрад амаль для ўсіх інтэрнатаў БДУ (трэці — дарэчы, перадапошні Калі гэта так, то за нумар ад вышэйшай да чацвёртай катэгорыі ў трохмесным пакоі студэнт будзе плаціць адпаведна ад 2 рублёў 70 капеек да 4 рублёў 30 капеек. Калі ж студэнт пажадае жыць у пакоі адзін (а такая магчымасць наўрад ці з'явіцца ў хуткім часе), то гэта яму абыдзецца ад 5 да 8 рублёў у суткі.

З нагоды паяўлення данага праекта ў рэктарацe універсітэта адбыўся семінар-нарада. Натуральна, адзінай думкі на дакумент не было. Па словах прарэктара універсітэта прафесара С. А. МАЛЕВІЧА, было вырашана накіраваць гэты праект для абмеркавання ў дэканаты, прафсаюзныя арганізацыі, студэнцкія аўдыторыі. Калі студэнты не дадуць згоды, універсітэт ад такой прапановы адмовіцца.

Плата ж за пражыванне ў інтэрнаце ўсё роўна павысіцца, па аб'ектыўных прычынах, нават тады, калі студэнты пажадаюць жыць па-ранейшаму.

## Вы жадаеце заказаць прывітальны адрас?

НЕ ШУКАЙЦЕ ДАЛЕКА АРГАНІЗАЦЫЮ, ЯКАЯ МАГЛА Б ДАПАМАГЧЫ ВАМ!

КАРЫСТАЙЦЕСЯ ПАСЛУГАМІ ДРУКАРСКАЙ ЛАБАРАТОРЫІ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА.

ЗАКАЗЫ ПРЫМАЮЦЦА ПА АДРАСУ: ВУЛ. МАСКОЎСКАЯ, 15 (БУДЫНАК ІНСТЫТУТА ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ).

ДАВЕДКІ ПА ТЭЛЕФОНАХ:
25-48-03,
25-28-14.

ЯК ВЫЖЫЦЬ?

## ГОЛАД НЕ ЦЁТКА

«Страта прытомнасці ад голаду» — такі дыягназ упершыню прагучаў у сценах адной з алма-ацінскіх ВНУ: студэнт страціў прытомнасць у аўдыторыі. Прыйшоў у сябе ўжо ў медпункце. Аказалася, ён быў вымушаны аддаць амаль усю стыпендыю гаспадарам кватэры...

«Комсомольская правда» прыводзіць прыклад са студэнткай Маскоўскага аўтамеханічнага інстытута, якая была дастаўлена ў студэнцкую паліклініку з «галоднымі» ацёкамі і дыягназам «аліментарная дыстрафія»...

Бацькаўская дзесятка-другая выратоўвае далёка не ўсіх. Красамоўнае сведчанне таму — сяміразовая страта прытомнасці ад голаду ў Маскоўскім фізіка-тэхнічным інстытуце...

Студэнтам не да відовішчаў — ім не хапае на хлеб. Тым больш, што ў большасці рэспублік былога Саюза з-за адсутнасці наяўных грошай у банках стыпендыю выдалі са спазненнем. Але нават пасля атрымання стыпендыі праблему харчавання нельга назваць вырашанай: студэнтам жа даводзіцца выдаткоўваць 25—30 рублёў у дзень.

Сёння студэнт не можа дазволіць сабе раскошу толькі вучыцца. Аднак, аб гэтым у адзін голас сведчаць выкладчыкі, паспяховасць пры гэтым падае з кожным днём. Да таго ж, усё часцей у студэнцкія паліклінікі звяртаюцца хлопцы і дзяўчаты з нервовым знясіленнем, бяссонніцай, зніжаным ціскам.

Таму перш, чым абвінавачваць студэнтаў у тым, што сёння ніякай карысці грамадству яны не прыносяць, падумаем: ці патрэбны нам заўтра недавучкі з мазолістымі рукамі?

## «СТУДЭНЦКІ СВЕТ»

Фестываль «Студэнцкі свет-92» арганізаваны для звычайных студэнтаў, якія амаль заўсёды жывуць надгаладзь.

Магчыма, менавіта для таго, каб не парушаць гэтую традыцыю, КІД «Равеснік» Чарнавіцкага дзяржаўнага універсітэта, арганізатар 20-га, юбілейнага, фестывалю, гарантуе начлег і 50-працэнтную аплату харчавання.

Прадстаўнікі ад нашага універсітэта паедуць за свой кошт, як кажуць, сваім ходам. Затое з 27 лютага да 1 сакавіка яны будуць мець унікальную магчымасць пакатацца на асабістых цыратах з Карпацкіх гор.

# Водбіск

## ЭКСКУРС У АНТЫЧНАСЦЬ

# ФІЛОСАФ ДЗЕЙНІЧАЕ Ў ГРЭЦЫІ

**Дыяген Лаэрцкі, які жыў у антычнасці, пакінуў нашчадкам трактат аб жыцці, вучэннях і выказваннях старажытнагрэцкіх філосафаў. Дыяген даволі бесклапотна выклаў падручны матэрыял у сваім трактаце, «поўным гісторыка-філасофскага сумбуру», (уключаючы анекдоты, плёткі і бяздоказныя факты), чым вельмі засмуціў дысцыплінаваных філосафаў нашага часу. Таму ўслед за вучонымі мужамі раім не спадзявацца на поўную дастаupernасць прыведзеных ніжэй урыўкаў з жыцця вядомых філосафаў.**

### САКРАТ

* Усё жыццё жыў у Афінах і з захапленнем спрачаўся з усімі не дзеля таго, каб пераканаць, а каб дайсці да ісціны.

Зразумеўшы, што філасофія фізічная грэкам абыякавая, ён стаў гаварыць пра этыку на кірмашах і ў майстроўнях...

Шмат разоў ён гаварыў, гледзячы на мноства кірмашовых тавараў: «Колькі ж ёсць рэчаў, без якіх можна жыць!»

* У спрэчках Сакрат быў мацнейшым, таму яго нярэдка калашмацілі і цягалі за валасы, а яшчэ часцей высмейвалі і абражалі. Ён прымаў гэта не працівячыся. Аднойчы ён атрымаў выспятак, але і гэта стрываў, а калі нехта здзівіўся, адказаў: «Калі б мяне лягнуў асёл, ці стаў бы я падаваць на яго ў суд?»

* Сваім простым жыццём ён ганарыўся... Казаў, што лепш за ўсё ясі тады, калі не думаеш пра закуску; чым менш чалавеку трэба, тым бліжэй ён да багоў.

Аднойчы нейкі Алквіад прапанаваў яму вялікі кавалак зямлі, каб пабудаваць дом.



Сакрат адказаў: «Калі б мне патрэбны былі сандаліі, а ты прапанаваў мне для іх цэлую бычыную скуру, ці не смешным быў бы я з такім падарункам?»

* Аднойчы ён паклікаў на абед багатых гасцей, і Ксантыпе (яго жонцы) было сорамна за свой абед. «Не хвалюйся,— сказаў Сакрат,— калі яны людзі прыстойныя — то яны застануцца задаволеныя, а калі пустыя, то нам да іх справы няма».

Сакрат казаў:

...што гэта дзіўна: кожны чалавек скажа, колькі ў яго авечак, але не ўсякі зможа назваць, колькі ён мае сяброў,— настолькі яны не ў пашане...

...што ён ведае толькі тое, што нічога не ведае...

...што сам ён есць, каб жыць, а іншыя жывуць, каб есці...

...што добры пачатак не дробязь, хаця пачынаецца з дробязі.

* Ужо старым чалавекам Сакрат вывучыўся граць на ліры. «Ці гэта непрыстойна — даведацца аб тым, чаго не ведаў?» — адказваў ён на кпіны.

* Ён пачаў першым меркаваць пра лад жыцця, і першага з філосафаў яго пакаралі смерцю па суду за кпіны над ганарыстымі гараджанамі. «Ты паміраеш бязвінна»,— казала яму жонка. Ён адказваў: «А ты б хацела, каб заслужана?»

Ён ужо збіраўся піць цыкуту, калі Апаладор прапанаваў яму прыгожы плашч, каб ён у ім памёр. «Няўжо мой уласны плашч быў варты, каб у ім жыць, і не варты, каб у ім памерці?» — спытаў Сакрат.

...Сяброў сваіх, якія плакалі па ім, ён ушчуваў, звяртаючы да іх у турме лепшыя свае прамовы; перад смерцю ён выказаў шмат прыгожых і годных меркаванняў.

### ДЫЯГЕН СІНОПСКІ

* На пытанне, што яму дала філасофія, ён адказаў: «Па меншай меры, падрыхтаванасць да ўсялякага павароту лёсу».

* Аднойчы нехта напомніў яму аб пачатку яго жыцця: «Жыхары Сінопа асудзілі цябе бадзяцца». «А я іх заставацца дома»,— адказаў Дыяген.

Калі нехта папракнуў яго выгнанне, Дыяген сказаў: «Няшчасны, гэта ж дзякуючы выгнанню я зрабіўся філосафам».

* Ён прыйшоў у Афіны як выгнаннік. Феафраст у адной са сваіх кніг расказваў, што Дыяген зразумеў, як трэба жыць у яго становішчы, калі паглядзеў на мыш, якая прабегла: яна не мела пасцілкі, не пужалася цемры і не шукала ніякіх уяўных асалод... Ён насіў торбу, каб захоўваць у ёй ежу, і кожнае месца аднолькава падыходзіла яму для снедання, сну і размовы.

* Аднойчы Дыяген размаўляў пра важныя прадметы, але ніхто яго не слухаў. Тады ён стаў крычаць па-птушынаму. Сабраліся людзі. Ён прысаромеў іх, што з-за глупства яны збягаюцца, а з-за важных рэчаў і не паварушацца.

* Гэта ён блукаў сярод белага дня з ліхтаром і тлумачыў: «Шукаю чалавека».

* Убачыўшы аднойчы, як хлопчык п’е ваду прыгаршчамі, ён выкінуў з торбы кружку, сказаўшы: «Хлопчык перасягнуў мяне».

* Убачыўшы аднойчы жанчыну, якая непрыстойна распасцерлася перад статуямі багоў, і жадаючы пазбавіць яе ад забабону, ён падышоў і сказаў: «А ты не падумала, жанчына, што бог, магчыма, знаходзіцца ззаду за табой, бо ўсё поўніцца яго прысутнасцю, і ты паводзіш сябе непрыстойна ў адносінах да яго?»

* Калі Платон даў вызначэнне, што мела вялікі поспех: «Чалавек ёсць жывёла на дзвюх нагах, пазбаўленая пер’я»,— Дыяген абскуб пеўня і прынёс яго ў школу, аб’явіўшы: «Гэта платонаўскі чалавек». Пасля гэтага да вызначэння было дададзена: «...і з шырокамі пазногцямі».

* Тым, хто баяўся нядобрых сноў, ён казаў, што ім было б лепш клапаціцца пра тое, што робяць днём, чым пра тое, што прыйдзе ў галаву ноччу.

* Калі ад яго збег раб, яму раілі яго адшукаць. «Смешна, — сказаў Дыяген,— калі раб можа жыць без Дыягена, а Дыяген не зможа жыць без раба».

* Ён ішоў у тэатр, калі ўсе выходзілі адтуль насустрач яму. На пытанне «нашто?» ён адказваў: «Менавіта так я і стараюся дзейнічаць усё сваё жыццё».

### АРЫСТОЦЕЛЬ

* Адзін балбатун, які моцна перашкаджаў сваім пустаслоўем, запытаў яго: «Я цябе не стаміў?» Арыстоцель адказаў: «Не, я не слухаў».

* «Сярод людзей,— казаў ён,— адны запасаюць, быццам павінны жыць вечна, а другія трацяць, быццам зараз памруць».

* На пытанне, якую ён атрымаў карысць ад філасофіі, ён адказаў: «Стаў дабраволь-на рабіць тое, што іншыя робяць, баючыся закону».



# АДКРЫЦЦЁ

У лістападзе газета «Сцяг юнацтва» паведаміла пра эпахальнае адкрыццё вучонага савецкай абароннай фірмы Р. Ф. Аўраменкі. Сутнасць яго гіпотэзы ў тым, што вакуум космасу, які лічыўся энергетычна «пустым», складаецца з хваляў электронаў і ўяўляе сабой суцэльны акіян энергій, своеасаблівую касмічную скарбніцу. Гэтая энергія выплёскваецца ў навальніцу ў выглядзе шаравых маланак. Аказваецца, энергію з неправяўленай формы можна пераводзіць у выяўную, можна ёю карыстацца. Па сутнасці, была вынайдзена альтэрнатыўная крыніца энергіі — выратаванне ад энергетычнага крызісу. Можна хоць зараз праектаваць электрастанцыі новага тыпу, паведамляў артыкул.

Адкрыццё нарадзілася ў згодзе з парадаксальнай квантавай тэорыяй. Аднак ці такое яно ўжо новае? Аналаг яму мы знойдзем у філасофіі індусаў. Адгалінаванне індуізму Веданта, зыходзячы з тэкстаў Вед, сцвярджае аб поўным адзінстве Парабрамы, адзінага, непадзельнага духу, асновы сусвету з Мулапракрыці, сваёй вечнай сілай ці энергіяй, каранём усяго існуючага. У адзінстве яны ўяўляюць сабой нябачны бок сусвету. Выкладаць Веданту далей, да поўнай яснасці, няма сэнсу. Бо пра гэта прасцей, але таксама зыходзячы са старажытнаіндыйскай канцэпцыі, сказаў Сатрэм: «У свеце ёсць толькі адна сіла, адзіны ток, які праходзіць праз нас, як і праз усе прадметы, які мае тыя ці іншыя ўласцівасці ў залежнасці ад узроўню, на якім ён дзейнічае... Гэта асноўная субстанцыя сусвету: СВЯДОМАСЦЬ — СІЛА, ЧЫТ-АГНІ, сіла Духа...»

Гэта толькі схема, мадэль сусвету. Рэальнасць, безумоўна, больш складаная. Але ці не цікава, што аб адным гавораць і навука, і філасофія перакананых ідэалістаў? Можа, сапраўды ў спазнанні сусвету мы калі-небудзь прыйдзем да Адзінства?

## ХТО ЁСЦЬ ХТО?

# «УВЕСЬ Я НЕ ЗМЯШЧАЮСЯ ПАМІЖ ЧАРАВІКАМІ І КАПЯЛЮШАМ»

Калі паглядзець уважліва на жыццё **Уолта, УІТМЕНА**, знакаміцейшага амерыканскага паэта, творчасць якога крытыкі дагэтуль разглядаюць як нешта пераходнае між рамантызмам і цвярозым матэрыялізмам, што-небудзь абавязкова падасца амаль неверагодным.

Уітмен, які нарадзіўся ў сям’і зусім небагатага фермера на Лонг-Айлендзе, наведваў школу, але ў адзінаццаць год вымушаны быў пайсці працаваць. Быў пасыльным у юрыста і рэпарцёрам, сельскім настаўнікам і цесляром. І так усё астатняе жыццё: блуканні, бясконцыя перамены месцаў, новыя сябры і ворагі. Нараджэнне Уітмена-паэта таксама не прайшло гладка. Дагэтуль крытыкі ламаюць галаву: «Што ж зрабіла Уітмена зусім нечакана паэтам, калі яму мінула 30?» Тлумачаць з дапамогай містыкі, загадкавага кахання, вывучаюць жыццё да дробязяў. А ён працаваў тады ў чарговай рэдакцыі, канфліктаваў са шматлікімі сваімі недобразычліўцамі ў газетных колах, загруз у палітыцы. І ў гэты ж час выдаў на свае грошы першы і адзіны вершаваны зборнік «Лісце травы».

Танюсенькая кніжка багацця не прынесла, гэтак жа, як і славы. Быў толькі адзін (!) станоўчы водгук — ад філасофа-трасцэндэнталіста Эмерсона. Пры жыцці Уітмен 9 разоў перавыдаваў сваё вершаванае дзіця, аднак вершы літаральна аблівалі брудам, сярэдняя амерыканская галава не ў стане была зразумець нечаканае наватарства. У яго вершах не толькі адсутнічала рыфма, але і поўнасцю ігнаравалася звыклая славесная мелодыя і рэгулярнасць. А над гэтым паўставала касмічнасць ідэй і абсалютная захопленасць жыццём. Што мог падумаць вечна заняты амерыканец, убачыўшы «Паэму пра сябе»? Гэта было занадта далёка ад звыклай рамантыкі.

Ідэі Уітмена ўспрынялі толькі пазней, праз шмат гадоў, калі шырыня яго бачання была цалкам ахоплена людзьмі. Але ад таго свет не здаваўся яму цьмяным. Запасу аптымізму і трываласці яму хапала на ўсіх паваротах лёсу. Неверагодным здаецца спалучэнне яго чалавечай цеплыні і веры ў жыццё з рэчаіснасцю яго існавання. Уітмен быў «шчырым дэмакратам». Выйшаўшы з сацыяльных нізоў, ён не мог не адгукнуцца на боль людзей у неспакойны час. Амерыка хутка капіталізіравалася, багацелі і канчаткова разараліся суайчыннікі, «амерыканская мара» здавалася недасяжнай, а ў рэчаіснасці жылі па суседству бруд і людская прыгажосць.

У час грамадзянскай вайны паміж буржуазнай Поўначчу і рабаўладальнікамі Поўдня Уітмен пайшоў працаваць у шпіталь. Стары ўжо чалавек, як добрая нянька, праседжваў ля ложкаў параненых. Ён літаральна асвятляў ім жыццё спагадай, суцяшэннем, залечваючы душэўныя раны. Многіх ён сам падняў на ногі. Параненыя запомнілі сівога барадатага дзеда, які прыносіў ім грошы, пісьмовыя прылады, цыгарэты, а ўвечары абыходзіў хворых з банкай варэння ці нейкімі ласункамі, адорваючы салдатаў, як родных. Гэта чалавечая, амаль дзіцячая шчырасць прыносіла Уітмену шчасце чалавечых адносін. У старасці ён пакутліва пісаў, што яму не хапае прысутнасці сяброў. Прыкуты паралічом да інваліднай каляскі, ён напісаў апошнія свае вершы, спакойныя і ззяючыя ўсё тым жа святлом. «Я раздам сябе ўсім, каго не шляху сваім стрэну...»

Годнасць і прыгажосць гэтага характара захапляе, нягледзячы на дробязі: няўседлівасць, няўсталяванасць. Ён пагарджаў грашыма і цягнуўся да людзей. Ён адчуваў у свеце нешта такое, што мы не чуем або не заўважаем. Нас, далёкіх яго спадкаемцаў, цікавіць: як жа трэба бачыць свет, каб адолець такі шлях? Даверымся вершам:

**Я паміраю разам з паміраючымі і нараджаюся з кожным нованароджаным немаўлём...**
**Я тварыш і сабрат людзей, гэткіх жа бессмяротных, як і я,**
**Яны не ведаюць, якія яны бессмяротныя, а я ведаю...**
**Я змяшчаю ў сабе ўсіх пакутнікаў і ўсіх адрынутых,**
**Бачу сябе ў турме ў абліччы іншага чалавека**
**І адчуваю тупы, невыказаны боль, які не праходзіць ніколі...**
**Я чую, я бачу бога ў кожнай рэчы, але не магу яго зразумець,**
**Гэтак жа я не разумею, няўжо можа быць што-кольвек лепшае за мяне,**
**І навошта мне марыць пра тое, каб разгледзець бога лепей, чым гэты дзень?..**
**«Паэма пра сябе»**

У паэта цікава складаліся адносіны да філасофіі. Яна ў сваім акадэмічным, навуковым выглядзе паэта не цікавіла. Ён павярхоўна глядзеў на «любамудрасць» і рэлігію, калі пісаў:

**Зноў я пераглядаю ўсе філасофіі і рэлігіі,**
**Можа яны правільныя і прыдатныя толькі ў класах і аўдыторыях, але нікуды не вартыя пад высокімі аблокамі, сярод краявідаў прыроды...**
**Тут кожны разумее, чаго ён варты...**
**«Песня пра вялікую дарогу»**

Уітмен пісаў сваю «філасофію жыцця» — і атрымалася дзіўная сугучнасць з Усходняй філасофіяй.

І хаця Уітмен крытыкаваў Эмерсона за «гэта старое ўсходняе ўяўленне... падхопленае царкоўнікамі...», якое не адпавядала навуцы, адначасова сам пісаў вершы па-філасофску глыбокія. І жыццё прывяло-такі яго да ўсходніх філасофскіх пастулатаў:

**Канчатковая мудрасць правяраецца не ў школах.**
**Мудрасць нельга перадаць ад таго, хто яе мае, таму, у каго яе няма,**
**Яна заўсёды і ўсюды, у кожнай рэчы і з’яве — яна іхні змест,**
**Яна сцвярджае ўпэўнена рэальнасць, бессмяротнасць свету і яго дасканаласць сцвярджае...**
**У плыні з’яў і рэчаў ёсць штосьці такое, што ў душы абуджае мудрасць...**
**«Песня пра вялікую дарогу»**

Параўнайце з выказваннем А. П. Блавацкай: «Веданне Ісціны» з пункту гледжання ўсходняй Мудрасці ёсць усведамленне боскасці чалавечай прыроды і адзінства ўсяго праяўленага жыцця, якое выражае сабой Жыццё Бога...»

Загадкавыя адчуванні, падобныя на уітменаўскія, мы знойдзем у Сатпрэма, які каменціруе вопыт ёга Шры Аўрабінды Гхоша: «Калі дзверы псіхічнага (цэнтра,— адна з прыступак рэалізацыі ёгі Аўрабінды — заўвага) адчыняюцца, самым першым і неаспрэчным з’яўляецца перакананне ў тым, што мы існавалі заўсёды і будзем давеку. Сапраўды, мы быццам бы выходзім у іншае вымярэнне, дзе нам адчыняецца, што мы старыя, як свет, і вечна маладыя, што гэта жыццё — гэта АДЗІН з вопытаў, АДНО звяно ў непарыўным ланцугу вопытаў і перажыванняў, якія цягнецца з далёкага мінулага і губляецца ў далёкім будучым. Раптам усё пашыраецца да маштабаў зямлі...

Уітмен-самавучка, пазбегнуўшы філасофіі з-за яе адрыву ад прыроднай натуральнасці, напісаў цудоўныя радкі пра дзяцінства, хутчэй за ўсё, зыходзячы з уласных адчуванняў:

**Было дзіця, якое кожны дзень выходзіла з хаты**
**І на якую б рэч толькі не зірнула яно —**
**само гэтай рэччу рабілася,**
**І кожная рэч станавілася часткай яго самога**
**На дзень ці на нейкую гадзіну дня,**
**Ці на доўгія-доўгія гады, ці нават на кругабегі гадоў...**
**«Было дзіця...»**

Пазней Шры Аўрабінда Гхош у «Пісьмах пра ёгу» напіша пра адчуванні ўладальніка новай, касмічнай свядомасці: «Чалавек пачынае адчуваць і іншых як частку самога сабе — таго ж самага «я», відазменнага Прыродай у іншых целах. Ці, па меншай меры, як таго, хто жыве ў больш шырокім, усеабдымным «я», якое цяпер робіцца яго ўласнай вялікай рэальнасцю. Фактычна ўсе рэчы пачынаюць мяняць сваю прыроду і знешні выгляд, усё ўспрыманне свету такім чалавекам радыкальна адрозніваецца ад успрымання тых, хто замкнёны ў сваім асабістым «я». Ён пачынае спасцігаць рэчы на аснове іншага вопыту...» — і далей піша пра «спасціжэнне праз атаясамленне», бо «мы ведаем штосьці таму, што мы самі ўжо і ёсць тое, што мы пазнаём...»

Сугучнасць думак Індыі і Амерыкі відавочная. Светаадчуванне Уітмена дзіўным чынам супадае з пачуццямі чалавека пашыранай свядомасці ва ўсходняй духоўнай традыцыі.

Уітмен — стыхійна, Аўрабінда Гхош — свядома, прысвяціўшы гэтаму жыццё, сцвярджаюць магчымасць эвалюцыі чалавечай свядомасці, пра якую казалі Веды (святое пісанне індуізму) тысячы гадоў назад.

Пераклад вершаў
Я. СІПАКОВА.
Н. ЖУК.

# МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

## АРТ-ТЭЛЕТАЙП

*Аб'яднанне «Відэафільм» абяцае стварыць на тэлебачанні свой канал і выпусціць не менш чым 1,5 тысячы гадзін кіна-, тэле- і відэапрадукцыі. «Відэафільм» — сёння адзіная ў нашай краіне кампанія, якая займаецца закупкай і распаўсюджваннем відэапрадукцыі згодна з міжнароднымі правіламі, што ўстаноўлены Бернскай канвенцыяй аб абароне інтэлектуальнай маёмасці.*

*Кінапіратцва па-ранейшаму квітнее. Мы не падпісалі пакуль Бернскую канвенцыю. І многія замежныя кінапрадпрымальнікі сталі выкарыстоўваць тыя ж незаконныя шляхі, па якіх прыходзяць да нас некаторыя фільмы з Захаду: там поўным ходам ідзе пірацкі гандаль савецкімі фільмамі.*

*Уступны ўзнос для членства ў Бернскай канвенцыі — 250 тысяч долараў...*

* * *

*Прыкладна праз год у Маскве пачнецца ўвядзенне дзічачага парка «Чароўны востраў», які павінен стаць аналагам сусветна вядомых Дыснейлендаў у ЗША і Японіі. Парк будзе размешчаны ў зоне Ніжніх Мнеўнікаў, што побач з алімпійскім комплексам у Крылацкім. Першая чарга павінна з'явіцца ўжо праз 5 гадоў, яна ахопіць больш чым чвэрць ад тых 325 гектараў, якія адведзены пад будаўніцтва. Сярод першых аб'ектаў будуць два атэлі міжнароднага класа на 2 тысячы месцаў.*

*У парку плануецца стварыць некалькі зон, якія будуць пераходзіць адна ў адну. Наведвальнікі атрымаюць магчымасць «вандраваць» па еўрапейскаму кантыненту і па Амерыцы, убачыць егіпецкія «пірамідзы» і копію індыйскага палаца Тадж-Махал, наведаць традыцыйныя атракцыёны Дыснейленда...*

*Прадугледжваецца таксама заапарк, спартыўна-прагулачная тэрыторыя, «цэнтр усіх рэлігій» і цэнтр дзіцячай мастацкай і тэхнічнай творчасці, а яшчэ магутная фабрыка-кухня. Мяркуецца, што наведванне парка будзе ў сярэднім працягвацца 6—8 гадзін.*

*Сусветная практыка пераконвае, што выдаткі на стварэнне «Чароўнага вострава» (яны складуць каля 2 мільярдаў долараў) акупяцца ўжо за першыя 5 гадоў яго існавання.*

* * *

*Тым, хто паглядзеў тэлефільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры» разоў 20 за час яго больш чым дзесяцігадовага існавання і больш не прагне гэтага, пэўна, будзе прыемна даведацца, што хутка з'явяцца на экране адразу два фільмы — працяг старога знаёмага. Яны называюцца «Мушкецёры 20 гадоў пасля» і «Таямніца каралевы Ганны, або Мушкецёры 30 гадоў пасля». Ужо закончаны мантаж і агучванне абодвух серыялаў.*

## ТАКОЕ ПРОСТАЕ КІНО

# ‹ДЗЁННАЯ ПРЫГАЖУНЯ› З ЗОРАЧКАМІ

Загадкі поўняць гэты фільм. Загадкава выглядае і яго 25-гадовы шлях на нашы экраны. Між тым, менавіта гэта садзейнічае сёння касавым зборам з "Дзённай прыгажуні". Людзі ідуць на забароненае калісьці ў чаканні нечага вельмі незвычайнага і... непрыстойнага. А непрыстойнага няма. Незвычайнае ж вельмі складанае для разумення — так што не ва ўсіх атрымліваецца вытрымаць да канца, і пакідаюць яны залу расчараваныя дзесьці ў сярэдзіне фільма...

Што ж, савецкая сістэма кінапракату пазбавіла нас густу даволі грунтоўна. Вельмі ўжо старанна абмяркоўвалася «наверсе», што дазволіць нам глядзець, а што забараніць. Мы і дагэтуль не можам кампенсаваць страты ў сваіх ведах пра сапраўднае кіно, хоць і атрымалі магчымасць доўга праседжваць сам-насам з відэамагнітафонам. Вось каб запісаць на адну бясконцую касету лепшыя фільмы сусветнага кінематографа, атрымаць дакладныя і падрабязныя анатацыі да іх і... вучыцца. Вучыцца таму, што заўсёды здавалася нам справай найлягчэйшай,— ГЛЯДЗЕЦЬ КІНО.

Але ж існаванне названай касеты наўрад ці рэальнае, бо толькі выглядае выратаваннем, а на самой справе ім не з'яўляецца. Намі страчаны не проста час. Мы згубілі многія яго адчуванні, гукі, пахі, адценні, дэталі — тое, што так добра захоўвае кінематограф пэўнага перыяду. Так, можна паспрабаваць іх аднавіць (сапраўднае мастацтва вечнае!) — але гэта будзе ўсяго толькі аднаўленне. Ды й кіно старэе хутчэй за іншыя віды мастацтва...

«Дзённая прыгажуння» нарадзілася ў 1967 годзе і аддзелена ад гледача, які ўпершыню знаёміцца з ёю сёння, нават не адным, а некалькімі часовымі пластамі. Усё інакш цяпер. Змяніліся ў тым ліку акцёрскія і апаратарскія прыёмы, неадназова абыграныя іншымі майстрамі рэжысёрскія адкрыцці Луіса Бунюэля... Але мы не можам рабіць гэтых параўнанняў, бо акрамя «Дзённай прыгажуні» мелі магчымасць паглядзець, бадай, толькі адзін фільм славутага маэстра — «Сціплая прывабнасць буржуазіі» (у лепшым выпадку — адзін). А Катрын Дзянёў ведаем больш як прыгожую актрысу (і ў асноўным па «Шэрбургскіх парасонах»), чым як уладальніцу рэдкага дару ўвасабляць у адным вобразе чалавечае «так» і «не» адначасова, што больш за ўсё цанілі рэжысёры, якія працавалі з ёй.

Наогул, нам сапраўды неабходны каментарый,



якім папярэджвае дэманстрацыю фільма вядомы кінакрытык Кірыл Разлогаў. Ён не толькі рыхтуе нас да вялікай колькасці загадак, але і паказвае фотаздымкі вядомых акцёраў, якія здымаліся ў стужцы, і тлумачыць, якую вобразную і сюжэтную нагрузку нясе кожны з іх, хто злы герой, а хто — светлы.

Такім чынам, мы, падрыхтаваныя, пачынаем глядзець фільм "Дзённая прыгажуня". І... амаль нічога не разумеем. Дзе сны Севярыны, а дзе ява, дзе рэчаіснасць, а дзе плён падсвядомасці гераіні? Што гэта за кацінае мяўканне за кадрам? І наогул, які ж гэта эратычны фільм, калі ў ім ні разу не паказана аголенае цела? Навошта тады стаяць у газетах дзве зорачкі побач з яго назвай — што ж тут толькі для дарослых?..

Нязвыклая для нас такая колькасць пытанняў у адным фільме, да больш легкаважных відовішчаў прывучаны мы. І зорачкі ў кінарэпертуары ўспрымаем заўсёды аднаэначна. А што, калі на гэты раз ацаніць абяцанне-зазыванне «толькі для дарослых» інакш: «толькі для разумных»? І напярэдадні знаёмства з фільмам здзейсніць незвычайны ўчынак — пайсці ў бібліятэку і пачытаць што-небудзь пра Бунюэля, Дзянёў і «Дзённую прыгажуню»? Нягледзячы на тое, што гэта карціна прыйшла да нас так позна, працы савецкіх кінакрытыкаў, ён прысвечаныя, ёсць. З іх мы можам даведацца аб тым, якое месца займае яна ў творчасці рэжысёра і выканаўцы галоўнай ролі; аб тым, што фільм гэты заваяваў адну з самых прэстыжных узнагарод у свеце кіно — Залатога льва на фестывалі ў Венецыі; што яго шэсцю па заходніх экранах спадарожнічала даволі скандальная слава (ці не гэта так адцягнула тэрмін нашай сустрэчы з ім?). У «Дзённай прыгажуні» ёсць літаратурная аснова — раман французскага пісьменніка Жозефа Кесэля. Але назваць фільм экранізацыяй гэтага твору наўрад ці магчыма: раман стаў амаль непазнавальным дзякуючы намаганням Бунюэля, які не здрадзіў у дадзенай стужцы сваёй звычайнай схільнасці да інтэлектуальнага падтэксту сюжэта і абсурдыстага гумару. Без гэтага гісторыя выглядала б як бульварная: аб жанчыне рэспектабельнага кола, якая шукае вострых адчуванняў у доме спатканняў і сустракаецца са светам «дна». Пэўна, мы лягчэй успрымалі б тую ж самую сюжэтную канву ў выкананні іншага рэжысёра, прыхільніка больш традыцыйных прыёмаў. Але тут — Бунюэль. Складана для нас.

Магчыма, гэта і ня́дрэнна — пакідаць кіназалу з адчуваннем неразгаданасці ўбачанага. Мы ж не кінакрытыкі, а звычайныя гледачы, і нам зусім не абавязкова ведаць усю падаплёку стварэння фільма, асаблівасці рэжысёрскай задумы і праблемы яе здзяйснення. Мы прыйшлі за кінавідовішчам. Але — не атрымліваем асалоду і не ўзбагачаемся. Так, прыгожая актрыса, яскравыя вобразы, цудоўныя восеньскія пейзажы, «жывы» Парыж, захапляльныя павароты сюжэта, багацце «пікантных» сітуацый... Але ўсё гэта — быццам рафінірavana некім для нас. Быццам не за сябе, а за кагосьці іншага глядзім мы гэты фільм і гэтак жа, не для сябе, у паўсілы, устрымаем яго звернутасць да нас.

Няўжо асуджаны назаўсёды?..

Вераніка БЯГУН.

На здымку: Катрын ДЗЯНЁЎ.

## НЕ АБМІНІЦЕ!

# ГІСТОРЫЯ ЖЫЦЦЯ.

Яна хутка стала бестселерам у многіх краінах свету, пачаўшы ў 1984 годзе са Злучаных Штатаў. Выйшла на 15 мовах. На рускай упершыню з'явілася ў 1985 годзе ў Парыжы — сённяшнім доме аўтара, вядомай опернай спявачкі Галіны Паўлаўны ВІШНЕЎСКАЙ.

«Галіна. Гісторыя жыцця» называецца гэта кніга. Нарэшце яна з'явілася ў нас і... імкліва знікла з паліц кніжных магазінаў.

Гэта яшчэ адна магчымасць для нас паглядзець на сваё жыццё, сваю краіну і яе лёс «абноўленымі» вачыма. Тое, што сустракаецца кожны дзень, становіцца звыклым, часам нават самае жудаснае. А ўзняўшыся на вышыню палёту самалёта, на якім Галіна Вішнеўская пакідала Радзіму, мы раптам можам убачыць навокал столькі нечаканага. На жаль, гэта будуць у асноўным сумныя адкрыцці...

У яе кнізе — вялікае мноства славутых імёнаў, значных падзей, неардынарных меркаванняў, шчырых эмоцый, сапраўдных пачуццяў. У яе кнізе — само жыццё.

Гэта ўрывак з кнігі, магчыма, не самы яскравы і эмацыянальна насычаны, але ён павінен даць уяўленне аб тым, чым прасягнута «Галіна»:

«Какая все-таки страшная судьба у поэтов в Советской России...

Кто же выплыл? Да те, кто вовремя перековался. И среди них, к сожалению, один из самых талантливых поэтов послевоенного периода Евгений Евтушенко...

...С тех пор прошло много лет. И вдруг уже здесь, в изгнании, мы встретились с ним в Лондоне. Он подарил Славе несколько небольших книжек своих стихов, после чтения которых мне ужасно захотелось с ним поговорить, чтобы понять, что же произошло с поэтом, так блестяще начинавшим свой творческий путь. Вскоре он был проездом в Париже, позвонил нам, и мы пригласили его к себе домой.

Мы сидели, по старой московской привычке, в кухне нашей огромной парижской квартиры, я угощала его пельменями, приготовленными настоящей сибирячкой,— думала, что ему, сибиряку, будет приятно.

Меня подмывало высказать ему все, что накопилось на душе... в конце концов, я плюнула на все церемонии...

— Вы подарили Славе несколько книжек ваших стихов. Я их прочла, и знаете, что меня потрясло до глубины души? Ваше гражданское перерождение, ваша неискренность, если не сказать вранье, ваше бессовестное отношение к своему народу.

— В чем, где?! Докажите! Это неправда!..

— А вы прочтите свои стихи из «Камазовской тетради» или «Монологи» — то американского писателя, то американского поэта, то американского артиста...

Вам советская власть наплевала в душу, а виновата в этом Америка? Почему же вы не возмутитесь у себя дома, а порождаете ненависть к американцам, которые вам ничем не обязаны и ничего плохого вам не сделали... И за всех-то вы успеваете болеть душой! Тут и кубинцы, и чилийцы, Камбоджа и Вьетнам... И, конечно, американские безработные, у которых, кстати, пособие по безработице, как вы знаете, больше зарплаты советского рабочего. Но почему-то не болит у вас душа за своего соотечественника.

На крыше Камаза,
Огромной, как будто ладонь
Гулливера,
Рабочий с кефиром и
хлебом...

Почему же вы его, советского рабочего, не пожалеете, что он полуголодный так горбатит всю жизнь на эти камазы, что в 50 лет он уже старик? Вы бывали на этих новостройках и знаете, что условия жизни там в полном смысле слова убийственные: зимой спят в палатках, в магазинах пустые прилавки. Вот и ишачит советский человек с краюхой хлеба в руке. А после работы он вместо обеда выпьет бутылку не кефира, а водки и придет в свой барак куражиться над соседями и мучить жену и детей. Вот эту-то каторжную жизнь вы воспеваете в своих стихах и преподносите читателям как романтику...

Он молча, с усмешкой слушал и вдруг засмеялся!

— Вы же — боярыня Морозова...

— Да, в этом смысле я— боярыня Морозова и, как она, от своего Бога не отступлюсь никогда ни за какие блага мира.

— Ну уж вы-то от ссылки ничего не потеряли: посмотрите, какая у вас квартира.

— А не приходит вам в голову, что, кроме материальных благ, существуют у людей высшие ценности? Как, например, отечество. Вам не представляется трагедией, что мои будущие внуки, возможно, не будут понимать меня, что я не смогу с ними говорить на чужом для них и непонятном им языке?..»

Яшчэ адзін адказ на скептычнае пытанне паэта Еўтушэнкі і ўсіх, каму ад'езд Галіны Вішнеўскай і яе мужа Мсціслава Растраповіча за мяжу здаецца справай вельмі прыемнай, бязбольнай, змяшчаецца на іншых старонках кнігі. Напрыклад, там, дзе аўтарка піша пра Хлеб. Якая пакута ў гэтых радках!

«На всю жизнь запомнила я вкус ржаного кронштадского хлеба. Его выпекали в морской пекарне огромными черными караваями по нескольку килограммов — корка внизу такая толстая, пропеченная, а верх блестящий, как лакированный. Вот, помню его — может, потому, что ничего, кроме хлеба, не было? Нет, в самом деле изумительный хлеб, а после войны такого уже не пекли...

Недавно в Париже зашла в русский магазин недалеко от моего дома, смотрю — лежит круглый черный хлеб, не такой, конечно, огромный, как пекли у нас в Кронштадте. Как мне его захотелось! Купила — еле добежала домой, отрезала кусок — еще теплый,— намазала маслом, и — с чаем сладким! Уж как блаженствовала! Пока всю буханку не съела, не могла остановиться. Это был тот самый вкус — вкус довоенного кронштадтского хлеба...»

А кульмінацыя кнігі «Галіна» — зразумела, яе канец. У ім быццам сканцэнтраваны самыя моцныя пачуцці, якія ўмясціліся на папярэдніх старонках:

«... Стараясь сдержать рыданья, приникнув лицом к окну, я смотрю, как широкой черной лентой бежит из-под ног моих земля... и я уношусь в небо все выше, выше...

И чем дальше я отрываюсь от нее, тем причудливее меняет она цвет и очертания под пробивающимися к ней лучами солнца. И вдруг, словно омытая весенним ливнем, превращается она в ярко-изумрудный луг, покрывается какими-то фантастическими цветами... И мне кажется, что бежит по нему девочка в белом платьице в горошек, с красной ленточкой в волосах... Вот она оторвалась от земли и уже летит по воздуху, протянув ко мне руки: «Вернись! Верни-и-ись!

Да ведь это же я — Галька-артистка!

Господи, помоги, дай силы, спаси и помилуй!

— Проща-а-ай!..

Детская фигурка становится все меньше и меньше, превращается в совсем маленькую точку... потом исчезает. Очертания земли сливаются в бесформенную, бесцветную массу, и белые облака словно саваном закрывают ее».

# НАШАГА З ВАМІ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

27 лютага

Зак. 2183

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.